УДК 91.914/919

# НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПРЫКЛАДНЫЯ ЗАДАЧЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ ГЕАГРАФІІ БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

**В. М. Сасноўскі**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, Савецкая, 18,*
*220050, г. Мінск, Беларусь,* vsosnovskij07@gmail.com

Разгледжаны найважнейшыя задачы сацыяльна-эканамічнай геаграфіі Беларусі на сучасным этапе яе развіцця, прапанаваны шляхі іх вырашэння. Паказана, да якіх памылак і страт прыводзіць адсутнасць глыбокага навуковага абгрунтавання пры размяшчэнні гаспадарчых аб'ектаў і прыняцця рашэнняў без актыўнага ўдзелу эканоміка-географаў.

***Ключавыя словы:*** сацыяльна-эканамічная геаграфія; тэрытарыяльная арганізацыя грамадства; аптымальная лакалізацыя; рацыянальнае размяшчэнне; тэрытарыяльныя адрозненні; кластэр.

# THE MOST IMPORTANT APPLIED PROBLEMS OF SOCIO-ECONOMIC GEOGRAPHY OF BELARUS IN MODERN CONDITIONS

**V.M. Sasnovsky**

*Belarusian State Pedagogical University, 18 Sovetskaya St. 220050, Minsk, Belarus,* vsosnovskij07@gmail.com

The most important tasks of the social and economic geography of Belarus at the current stage of its development are considered, and ways of solving them are proposed. It is shown what errors and losses the lack of deep scientific justification leads to when locating economic objects and making decisions without the active participation of economic geographers.

***Keywords:*** socio-economic geography; territorial organization of society; optimal localization; rational location; territorial differences; cluster.

Хуткае развіццё грамадства, узнікненне новых з'яў і працэсаў (змяненне клімату, глабалізацыя, абвастрэнне міжнацыянальных канфліктаў і інш.) прымушаюць шукаць адказы на выклікі часу не толькі палітыкаў, але і навукоўцаў. Менавіта навука павінна пракладваць дарогу там, дзе чалавецтва сутыкаецца з невядомым і небяспечным. На жаль, разуменне гэтых слоў не стала аксіёмай і па-ранейшаму ігнаруецца ў многіх краінах свету, у тым ліку і ў Беларусі. Пры агульных тратах на навуку, якія складаюць менш 1 % ВУП краіны, складана чакаць прарыўных ідэй як у

эканоміцы, так і ў іншых сферах чалавечай дзейнасці. Больш таго, даводзіцца канстатаваць, што цяперашняе стаўленне да навукі стварае дадатковыя цяжкасці ў рэалізацыі шматлікіх прыкладных праектаў, што нярэдка прыводзіць да вялікіх матэрыяльных і фінансавых страт.

Сацыяльна-эканамічную геаграфію (СЭГ) нельга аднесці да футуралагічных навук, яна больш скіравана на вырашэнне паўсядзённых праблем. Аднак, як і кожная грамадская навука, СЭГ павінна імкнуцца прадбачыць, да якіх вынікаў могуць прывесці новыя з'явы і працэсы, а калі яны нясуць небяспеку грамадству — папярэдзіць і прадухіліць іх. Такая высокая місія СЭГ, як і іншых накірункаў геаграфічнай навукі, звязана з тым, што менавіта яна ў значнай ступені адказная за тое, што адбываецца ў прасторы, а калі быць больш дакладным — на тэрыторыі той ці іншай краіны. Іншымі словамі, наколькі аптымальна выглядае тэрытарыяльная арганізацыя грамадства (ТАГ) залежыць ад таго, як плённа папрацавалі географы ў цеснай сувязі з іншымі спецыялістамі. Само паняцце "тэрытарыяльнай арганізацыі грамадства ў шырокім разуменні слова ахоплівае ўсе пытанні, якія тычацца тэрытарыяльнага падзелу працы, размяшчэння прадукцыйных сіл, рэгіянальных адрозненняў у вытворчых адносінах, рассялення людзей, узаемаадносін грамадства і прыроды, а таксама праблемы рэгіянальнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі" [1, с. 3].

Зыходзячы з гэтага адной з найважнейшых задач СЭГ Беларусі з'яўляецца *аптымальная лакалізацыя аб'ектаў (вытворчых і сацыяльных) на яе тэрыторыі.* Інакш кажучы, размова ідзе пра абавязковы улік як традыцыйных (прыродныя і працоўныя рэсурсы, транспартныя ўмовы і інш.), так і новых (наяўнасць інавацыйнай і рынначнай інфраструктуры, экалагічныя ўмовы і інш.) і нематэрыяльных (творчы патэнцыял мясцовага насельніцтва, прыналежнасць да рэлігійных канфесій і інш.) фактараў пры выбары месцаў іх лакалізацыі. Зразумела, што розныя аб'екты патрабуюць рознай іх сукупнасці, аднак ігнараванне нават некаторых з іх прыводзіць да эканамічных і сацыяльных страт. Памылкі пры размяшчэнні любых гаспадарчых аб'ектаў не выпраўляюцца, а жорстка караюцца праз неабходнасць губляць сродкі на новае іх будаўніцтва альбо рэканструкцыю. На жаль, сённяшняя рэчаіснасць дае падставы сцвярджаць, што размяшчэнне шматлікіх аб'ектаў, якое мела месца толькі ў апошнія дзесяцігодзі, далёкае ад аптымальнага (напрыклад, Беларуская АЭС, індустрыяльны парк "Вялікі камень" і інш.). Яшчэ больш праблематычна выглядае сітуацыя з размяшчэннем сацыяльных аб'ектаў — магазінаў, станцый тэхнічнага абслугоўвання і інш. Здавалася б, тут, дзе пануе прыватны бізнес, усё павінна быць узважана, аднак практыка сведчыць, што камерцыйная зацікаўленасць, на жаль, пераважае і часта імкненне папоўніць мясцовыя бюджэты штурхае дзяржаўных чыноўнікаў да ахвяравання

інтарэсамі краіны. Увогуле трэба падкрэсліць, што факт прыватнай уласнасці ўносіць кардынальныя змены ў паняцце “аптымальная лакалізацыя”, асабліва ў суадносіны дзяржаўных і прыватных інтарэсаў.

Развіццё НТП, адкрытасць эканомікі Беларусі знешняму свету, дэпапуляцыя, істотна змяняюць уплыў традыцыйных фактараў на праблему комплексаўтварэння і сам характар фарміравання тэрытарыяльных сістэм. З гэтага выцякае яшчэ адна задача — *пошук новых формаў прасторавай арганізацыі прадукцыйных сіл.* Агульнапрынятым сёння ў развіцці і размяшчэнні прадукцыйных сіл Беларусі і шматлікіх краін свету лічыцца кластэрны падыход. Кластэр уяўляе сабой сукупнасць размешчаных у рэгіёнах роднасных прадпрыемстваў — вытворцаў сыравіны і розных камплектуючых, а таксама арганізацый, якія аказваюць спецыялізаваныя паслугі. Акрамя таго, у склад кластэра могуць уваходзіць ВНУ, НДІ і іншыя структуры, якія працуюць у цеснай узаемасувязі з эканомікай рэгіёна (будаўнічыя арганізацыі, транспарт, сувязь і інш.). Ідэя эканамічнай мэтазгоднасці кампатнага размяшчэння ўзаемазвязаных прадпрыемстваў і спалучаных з імі аб’ектаў не новая, яна знайшла сваё ўвасабленне яшчэ ў 20 – 30-я гады XX ст. у тэорыі тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў (ТВК). Пазней яе шырока выкарыстоўваў М. Портэр [2], праўда, у яго гэта ўжо былі не ТВК, а кластэры. Аднак сутнасць не змянілася і галоўным пры такім характары развіцця і размяшчэння вытворчасці павінна заставацца атрыманне дадатковых эканамічных пераваг за кошт зніжэння бягучых і эксплуатацыйных выдаткаў, а таксама тэхналагічнага абнаўлення за кошт канкурэнцыі аб’яднаных у кластэр кампаній. На жаль, наша рэчаіснасць сведчыць аб іншым, часцей гэта кангламерат выпадковых прадпрыемстваў, якія не заўсёды звязаныя паміж сабою нават тэхналагічна. Больш таго, ужо пасля ўвядзення ў строй Беларускай АЭС не бачна, каб вакол яе пачаў фарміравацца сапраўдны кластэр, хаця яго стварэнне “з нуля” ўяўляецца больш прывабным у параўнанні з ужо існуючымі вытворчасцямі.

Адна з найважнейшых задач СЭГ — *выяўленне тэрытарыяльных адрозненняў.* Выяўленне адрозненняў “ад месца да месца” з’яўляецца адным з асноўных крытэрыяў геаграфічнасці. Маецца на ўвазе не проста іх канстатацыя, а тлумачэнне прычын і пошук варыянтаў па змяншэнні неапраўдана вялікіх дыспрапорцый. У гэтых адносінах належыць яшчэ вельмі шмат што зрабіць эканоміка-географам краіны. Справа ў тым, што за апошнія гады адбыліся істотныя змены ў абліччы розных тэрыторый (гарадоў, раёнаў і інш.), а геаграфічная навука не толькі не заўважае іх, але і не дае адказаў, якім чынам змяніць сітуацыю да лепшага. Яна па-ранейшаму канстатуе высокую тэрытарыяльную дыспрапарцыянальнасць, а пошук крокаў па яе змяншэнні пакідае іншым. Зразумела, размова ідзе не аб

тым, каб дасягнуць аднолькавага ўзроўню спажывання тавараў ці паслуг, а пра тое, каб не дапусціць перакосаў у гэтым спажыванні. Нельга лічыць нармальнай сітуацыю, калі, напрыклад, па ўзроўні добраўпарадкавання жыллёвага фонду насельніцтва адміністрацыйных раёнаў розніца дасягае амаль 10 разоў, а калі паглядзець на гэту праблему ў разрэзе “горад–сяло”, сітуацыя выглядае яшчэ горш. Такія дыспрапорцыі ва ўмовах жыцця штурхаюць людзей да міграцыі і ўвогуле пагаршаюць іх самаадчуванне. Нягледзячы на тое, што тэрытарыяльныя адрозненні з’яўляюцца аб’ектыўнай з’явай і характэрны для большасці краін свету, іх змяншэнне нярэдка залежыць ад суб’ектыўных рашэнняў. Асабліва гэта заўважна на этапе пераразмеркавання бюджэтных сродкаў і прыняцця рашэнняў аб новым будаўніцтве. Не выклікае сумненняў тое, што пытанні рэгіянальнага развіцця вырашаліся б хутчэй і эфектыўней, калі б у Беларусі на нацыянальным узроўні існаваў спецыялізаваны орган (установа) адпаведнага накірунку, напрыклад, Міністэрства рэгіянальнага развіцця, якое можна было б спалучыць з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, тым больш, што адно звязана з другім. Удзел эканоміка-географаў у яго рабоце – жыццёвая неабходнасць.

Непасрэдна з папярэдняй задачай звязана яшчэ адна — *эканамічнае раяніраванне і абгрунтаванне неабходнасці ўдасканалення адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення (АТД) краіны.* Кардынальныя змены ў размяшчэнні прадукцыйных сіл апошніх гадоў тэрмінова патрабуюць адпаведнага картаграфічнага адлюстравання ў выглядзе эканамічных раёнаў. Пры гэтым размова ідзе не абавязкова пра канструктыўны іх напрамак, нават пазнавальнае (апісальнае) раяніраванне з’ўляецца актуальным. Між тым менавіта раяніраванне адлюстроўвае аб’ектыўнасць працэсу тэрытарыяльнага падзелу працы, выяўляе заканамернасці ў прасторавай арганізацыі грамадства і выступае, як правіла, квінтэсэнцыяй навуковага даследавання. Адсюль узнікае вострая неабходнасць ва ўдасканаленні АТД Беларусі, якое істотна не змянялася ўжо больш за паўстагоддзя. Праблема, як кажуць, перазрэла. Прычыны неабходнасці такога ўдасканалення разнастайныя – неапраўдана высокая тэрытарыяльная дыферэнцыяцыя ва ўзроўні і якасці жыцця насельніцтва; абмежаванасць рэсурснага, сацыяльна-эканамічнага, дэмаграфічнага і прыродна-экалагічнага патэнцыялаў, што не дазваляе ў поўнай меры рэалізаваць задачы ўстойлівага развіцця на ўзроўні асобнай адміністра-цыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і асабліва на нізавым узроўні; неадпаведнасць граніц АТД рэальна існуючым тэрытарыяльным сацыяльна-эканамічным сістэмам; грувасткасць АТД, асабліва на ўзроўні сельскіх саветаў, што патрабуе вялікіх выдаткаў; новыя тэндэнцыі ў жыцці грамадства, якія звязаны з развіццём інфраструктуры (транспарту, тэлекамунікацый,

інфармацыйных тэхналогій і інш.), ростам адукацый-нага ўзроўню насельніцтва, яго мабільнасці і інш. Здавалася б, пры такой колькасці аргументаў працэс змен непазбежны, да таго ж з боку навукоўцаў і практыкаў неаднаразова ўносіліся прапановы па ўдаскана-ленні АТД, “а воз и ныне там”. Увогуле тэндэнцыя “не заўважаць” вастрыню сучасных рэгіянальных праблем і “не прыслухоўвацца” да голасу навукоўцаў не можа не хвалявацць. Менавіта такая рэакцыя адбылася на міжнародную навукова-практычную канферэнцыю, якая адбылася ў 2021 г. [3]. Аднак не хочацца губляць аптымізму, тым больш што кадравы патэнцыял эканоміка-географаў і эканамістаў, якія займаюцца праблемамі рэгіянальнай эканомікі, дазваляе паспяхова справіцца з акрэсленымі задачамі і зрабіць рэальны ўнёсак у аптымізацыю тэрытарыяльнай арганізацыі краіны. Замаруджванне ў іх вырашэнні – прамы шлях да іх ускладнення і пагроз нацыянальнай бяспекі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Хорев Б. С.* Территориальная организация общества. М.: 1981.
2. *Портер М.* Международная конкуренция. М.: 1993.
3. Социально-экономическая география в XXI веке: Новые реалии и практические возможности. Материалы международной научно-практической конференции. Республика Беларусь. Минск, 19-20 ноября 2021 года. Мн.: БГУ, 2022.